ГОЛАС РАДЗІМЫ

№ 58 (843)
Верасень
1964 г.
Цана
2 кап.

ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА
ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ

17 верасня 1964 года—знамянальная дата ў жыцці нашага народа. Споўнілася 25 год з дня ўз'яднання беларускага народа у адзінай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы.

ВЫСОКІ ГОСЦЬ З ІНДЫІ

Па запрашэнню Савецкага ўрада ў нашу краіну прыбыў прэзідэнт Рэспублікі Індыі Сарвапалі Радхакрышнан.

12 верасня ў Крамлі адбылася гутарка М. С. Хрушчова з прэзідэнтам С. Радхакрышнанам.

У ходзе цёплага, сардэчнага абмену думкамі былі падвергнуты абмеркаванню пытанні далейшага развіцця дружалюбных савецка-індыйскіх адносін. Абмеркаваны таксама праблемы сучаснага міжнароднага становішча, асабліва становішча ў Паўднёва-Усходняй Азіі.

Затым прэзідэнт С. Радхакрышнан адправіўся ў паездку па краіне.

Выступае танцавальная група ансамбля «Нёман».

Гродзенскі азотнатукавы камбінат сёння.



СВЕТЛЫМ ШЛЯХАМ

Чвэрць века. Для гісторыі гэта невялікі адрэзак часу. Але якіх велічных здзяйсненняў і пераўтварэнняў могуць дабіцца людзі, стаўшы на светлы шлях будаўніцтва новага жыцця. Аб гэтым пераканаўча сведчаць поспехі заходніх абласцей нашай рэспублікі.

Да 1939 года гэтыя землі лічыліся аграрным прыдаткам буржуазна-памешчыцкай Польшчы з адсталай прамысловасцю і нізкай культурай. Пастаянным спадарожнікам працоўных горада і вёскі тут было масавае беспрацоўе. І таму, зразумела, калі гітлераўская Германія напала на Польшчу, над працоўнымі заходніх абласцей навісла новая пагроза—пагроза фашысцкай няволі. Савецкі Саюз не мог застацца раўнадушным да лёсу сваіх братоў і сясцёр.

З прыходам Савецкай улады па-новаму склаўся лёс былых батракоў і беспрацоўных. Людзі пачалі выходзіць на шырокі шлях эканамічнага і культурнага развіцця. Але вайна, якую навязала савецкаму народу гітлераўская Германія, на некаторы час затрымала будаўніцтва ў гэтым краі. Народ узяўся за зброю. На франтах і ў партызанскіх атрадах ён мужна змагаўся з лютым ворагам да поўнай перамогі.

Зноў над Савецкай Беларуссю заззяла сонца свабоды. Рэспубліка пакрылася рыштаваннямі, пачалі адкаўляцца разбураныя калгасы і саўгасы, расла культура і матэрыяльны дабрабыт народа. І сёння на кожным кроку мы бачым новае. Ад блакітных азёр Браслаўшчыны і да сівой Прыпяці, прыдняпроўскіх гоняў і пагранічнага Буга шчасліва і заможна жывуць савецкія людзі. А навокал — цудоўныя гарады, вёскі, заводы і фабрыкі.

Шырокае развіццё атрымала тут машынабудаўнічая, хімічная, дрэваапрацоўчая, тэкстыльная і іншыя галіны прамысловасці. На ўсю рэспубліку вядома прадукцыя Гарадзейскага і Жабінкаўскага цукровых заводаў, Баранавіцкага баваўнянага камбіната, Пінскага завода штучных скур. А Гродзенскі азотнатукавы завод і Бярозаўская ДРЭС—гэта буйныя прадпрыемствы хімічнай і энергетычнай прамысловасці не толькі ў рэспубліцы, але і ў краіне.

Ва ўсіх абласцях рэспублікі адкрыта шмат вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, мноства школ, тэатраў, клубаў, бібліятэк. Дзеці былых батракоў і беспрацоўных заходніх абласцей сталі вучонымі, інжынерамі, аграномамі, афіцэрамі Савецкай Арміі, людзьмі самых разнастайных прафесій.

Расце і мужнее сёння Савецкая Беларусь у адзінай шматнацыянальнай сям'і народаў краіны Саветаў.

НА ЗДЫМКАХ:

Уборка кукурузы на палях Брэстчыны (здымак злева). Будаўніцтва жывёлагадоўчых памяшканняў у калгасе «Перамога» Свіслацкага раёна.

Хроніка · Хроніка

✦ *У Савецкім Саюзе зроблен чарговы запуск штучнага спадарожніка Зямлі «Космас-45». На борце спадарожніка ўстаноўлена навуковая апаратура, прызначаная для працягу даследавання касмічнай прасторы ў адпаведнасці з праграмай, аб'яўленай ТАСС 16 сакавіка 1962 года.*

✦ *Савецкі ўрад запрасіў прэзідэнта Пакістана наведаць Савецкі Саюз. Прэзідэнт з задавальненнем прыняў гэтае запрашэнне.*

✦ *У Мінску пачала работу ўсесаюзная школа перадавых метадаў працы ў будаўніцтве. Для ўдзелу ў ёй з Архангельска і Новасібірска, Растова і Іркуцка, Горкага і Варонежа — з будоўляў усіх эканамічных раёнаў краіны прыбылі інжынеры і рабочыя-інструктары па ўкараненню перадавых метадаў.*

✦ *У Дзяржаўнай бібліятэцы імя Ул. І. Леніна закрылася выстаўка польскай кнігі. Кнігі па гісторыі, эканоміцы, фінансах, матэматыцы, медыцыне, сельскай гаспадарцы, філасофіі, шматлікія творы мастацкай літаратуры — усяго больш тысячы тамоў перададзены Міністэрствам культуры і мастацтва ПНР у дар Дзяржаўнай бібліятэцы Беларусі.*

✦ *Закончыўся ўсесаюзны кірмаш вырабаў лёгкай прамысловасці, які праходзіў у Маскве. У яго рабоце прымала ўдзел і віцебская швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі», якая прадставіла для разгляду каля 200 узораў сваей прадукцыі. Высокую ацэнку журы атрымалі мужчынскія касцюмы, выпушчаныя з тканін, якія маюць хімічнае валакно.*

✦ *Экіпаж судна «Віцебск» Мурманскага траўлернага флоту, які знаходзіцца зараз на прамысловым лове ў моры, 7 верасня выканаў гадавы план. Рыбакі судна вылавілі з пачатку года 45 тысяч цэнтнераў рыбы.*

✦ *За добрасумленную працу ў калгасе «Кастрычнік» Нясвіжскага раёна шафёр Уладзімір Толкач быў прэміраваны бясплатнай турысцкай пуцёўкай у Германскую Дэмакратычную Рэспубліку. Два тыдні калгасны шафёр правёў сярод нямецкіх сяброў.*

РЭПАРТАЖ

ВОСЕНЬ У ВЕРХНІМ

СВЕТЛЫМ ШЛЯХАМ

«Як там у нас цяпер у Верхнім, пры Савецкай уладзе? Пабывайце, калі ласка, у маёй роднай вёсцы...»

З пісьма эмігранта.

Сярод многіх назваў вёсак, куды штодзённа адпраўляюцца аўтобусы з Глыбокага, значыцца і сяло Верхняе. Дваццаць мінут дарогі, і, мінуўшы сад на ўзгорку, аўтобус спыняецца каля двухпавярховай Вярхнянскай школы.

Адсюль вёска як на далоні, уся ў зяляніне садоў. Верхняе — цэнтр вялікага калгаса імя Чапаева. Тутэйшы калгас— гэта чатыры тысячы гектараў былой панскай зямлі, гэта вёскі Верхняе, Хоцькі, Залеські, Запаснікі, Навасёлкі... Усёй гэтай зямлёй валодаюць цяпер 430 калгасных сем'яў. На кожную з іх прыпадае па 90 гектараў зямлі, у тым ліку па 40 гектараў ворнай.

І яшчэ крыху статыстыкі. На ферме арцелі — паўтары тысячы галоў буйнай рагатай жывёлы (не лічачы кароў у асабістым карыстанні сем'яў), многа птушкі, свіней. У калгасным гаражы — дзесяткі трактараў, аўтамашын, камбайнаў. 650 тысяч рублёў — такі даход арцелі толькі ў мінулым годзе ад продажу збожжа, мяса, малака, льну, яблык...

Але, і яблык!

Адкуль жа ў Верхнім сады? Не было ж іх раней у тутэйшых месцах. Гэта ўжо гісторыя, якая цесна звязана з імем старшыні арцелі былога партызана Максіма Клімянка.

Як гаварыцца, без музыкі сустрэлі вярхнянцы свайго новага старшыню. Ведалі толькі, сам, па сваёй волі папрасіўся камуніст працаваць у калгас. «Ну, што скажаш нам добрага?» — гаварылі погляды хутаран. Спачуванне і недавер'е было ў іх вачах. «А вось што, таварышы... Спачатку пасадзім арцельны сад. Вунь на той пустэчы, бачыце?» — «Ды хіба там зямля? Ледзь трава расце?» — «Давайце ўсё ж паспрабуем...»

Капаць ямкі пад саджанцы выйшлі вярхнянцы разам з Максімам Клімянком. Радок за радком рос на пустэчы малады сад. «Ну вось, адна добрая справа зроблена, — усміхнуўся старшыня, калі была пасаджана апошняя яблынька. — А цяпер, таварышы, нядрэнна было б, каб кожная сям'я пасадзіла сад каля свайго дома. Яблынь па дваццаць...» Да канца восені каля дамоў у Верхнім і ў іншых сёлах таксама былі пасаджаны сады — каля чатырохсот садзікаў, а ўсяго больш шасці тысяч яблынь і груш. «А цяпер возьмемся за сваю зямлю, — сказаў на адным са сходаў Максім Клімянок. — Як належыць возьмемся! Гэта ж наша з вамі зямля».

Узяліся і за зямлю.

Гэта было ў 1953 годзе, дзесяць год таму назад...

Восень жа якая, золата! Цяжка сказаць, што меў пры гэтым на ўвазе Максім Клімянок. Ці то першыя праблескі чырвані ў лісцях, ці то сакавітую жаўцізну яблык у садах, ці шчодра пазалочаныя сонцам сцірты збажыны на таках.

— Не збажына, а золата!— усміхаецца ў пышныя вусы Антон Шарынскі, вагаўшчык другой брыгады, перасыпаючы са жмені ў жменю ручаёк жыта. Шарынскі—заслужаны калгаснік. Ёсць такое ганаровае званне ў арцелі.

Горда пахаджвае па таку Пётр Краміч, брыгадзір. Што ж, у яго ёсць для гэтага падстава: другая брыгада сабрала сёлета добры ўраджай—па дваццаць цэнтнераў з гектара.

— Падумаеш, па дваццаць!— наўмысна неахайна кідае ён.— Можна і больш...

Гудзе малацілка, выкідваючы бясконцую стужку саломы. Час ад часу да яе пад'язджае «Беларус» са стагакідам і лёгка падымае груду саломы на сцірту. Адзін за другім ёміста кладуцца на вагі тугія мяшкі з зернем, а ў блакноце Антона Шарынскага з'яўляецца яшчэ некалькі лічбаў: яшчэ некалькі цэнтнераў збожжа паступіць на склад. І з трэцяй брыгады, і з шостай...

І зноў бяжыць «Волга» палямі, міма дабротных фермаў, статкаў арцельнай жывёлы, абганяючы аўтамашыны з кукурузай. Адчуваецца ў гэтым рабочым рытме зладжанасць, якоесьці адзінае жаданне хутчэй і лепш зрабіць агульную справу.

А не так ужо даўно глядзелі тутэйшыя людзі на калектыўную працу зусім па-іншаму. «Хіба можна, Максім Аляксандравіч, — гаварылі яны старшыні, — усім разам даглядаць чатыры тысячы гектараў зямлі? Дзе ж тут гаварыць аб якасці. Сумленне ж у людзей рознае...» А цяпер людзі прывычна гавораць аб гонары брыгады, хварэюць за агульны поспех. Ого, паспрабуй цяпер праўленне выключыць каго з калгаса!

— А вось тут, верце не верце, яшчэ нядаўна было балота, — гаворыць Клімянок. — Купіны, асака...

Цяжка паверыць, што на гэтым месцы паміж Верхнім і Канстанцінавым было балота. Не верыцца, таму што бушуе тут кукуруза, гародніна і гордасць калгаса — дзесяткі гектараў гібрыду капусты з бручкай. 80 тон клубняў і 25 тон бацвіння дасць кожны гектар гэтай культуры.

Як сапраўдны гаспадар, улюбёны ў сваю зямлю, Максім Клімянок хоча паказаць як мага больш. Пабывалі на фермах. Пабудаваны яны на доўгія гады з цэглы, крыты шыферам. Усюды чысціня і парадак. На кожнай ферме аўтапаілкі, неабходныя механізмы.

Поўнасцю механізаваны ў арцелі і ўсе працэсы апрацоўкі льну.

Ідзём зялёнай вуліцай. Кідаецца ў вочы — кожны другі дом новы, многія з белай цэглы. То там, то тут каля старых дамоў груды цэглы. Хутка і яны ператворацца ў новыя катэджы са светлымі «не вясковымі» вокнамі, у якія абавязкова будуць глядзецца яблыні і грушы. Проста прыемна глядзець на дамы вярхнянцаў.

— А гэта чый такі прыгожы? — паказваю на адзін з іх з сонечнай верандай.

— Нашага шафёра, — не здзіўляючыся, адказаў Максім Аляксандравіч. — А вось гэтыя, дзвюхкватэрныя будаваў калгас.

Растлумачыў, што такія дамы будуюцца для перасяленцаў з хутароў у растэрміноўку на дзесяць—дванаццаць год па 150 рублёў у год. Для сям'і гэта не накладна.

На свае сродкі пабудаваў калгас і некалькі школ, лазню, магазіны і іншыя грамадскія збудаванні. 120 жылых дамоў пабудавана ў апошнія гады ў тутэйшых вёсках.

А што далей? Якія ў вярхнянцаў планы на будучае?

— О, спраў у нас хоць адбаўляй! — ажыўляецца Клімянок. — Натуральна, канчатковая мэта — камунізм... Ну, а на бліжэйшы час канкрэтна наступнае. Дваццаць двухпавярховых жылых дамоў, дзіцячыя яслі, новы дом культуры. Пасадзім парк. А яшчэ вось што задумалі... Вы не былі на возеры Заплiссе? Шкада. Прыгажосць! Будзем будаваць там санаторый разам з двума суседнімі калгасамі. Нядрэнна?

Гэта планы культурнага будаўніцтва. А колькі іншых! Праўленне склала спіс машын, якія трэба купіць у дзяржавы ў самы бліжэйшы час для таго, каб максімальна механізаваць працу ва ўсіх галінах. Так патрабуе перш за ўсё калгасная моладзь. І гэта зразумела. Прыходзячы ў калгас пасля вучобы ў дзесяцігодцы, яны хочуць як мага паўней выкарыстаць свае веды на практыцы. Карацей кажучы, чалавек павінен мець работу адпаведна сваёй адукацыі. Інакш цяпер нельга. І калгас, не шкадуючы, адпускае сродкі і на новыя механізаваныя фермы, і на новыя машыны. Усё ж гэта акупіцца ў сто разоў. Праз некалькі год арцель будзе атрымліваць не менш мільёна рублёў даходу ў год. Ды і гэтая лічба не мяжа. Не можа быць мяжы для росту, калі людзі да канца зразумелі перавагу калектыўнай працы, калі мэта іх барацьбы — яшчэ лепшае жыццё.

В. ВІКТАРАЎ.

Глыбоцкае ўпраўленне.

З КРАІНЫ УЗЫХОДЗЯЧАГА СОНЦА

ЯПОНСКІЯ ПАРЛАМЕНТАРЫІ Ў МІНСКУ

У Савецкім Саюзе знаходзіцца парламенцкая дэлегацыя Японіі. Яе ўзначальвае старшыня Пастаяннага камітэта палаты прадстаўнікоў па парламенцкіх справах, вядомы дзеяч ліберальна-дэмакратычнай партыі Кэндзі Фукунага.

Адна група дэлегацыі на чале з вядомым дзеячом ліберальна-дэмакратычнай партыі, старшынёй Пастаяннай камісіі па справах палаты саветнікаў Сігэо Танака прыбыла ў Мінск. У саставе дэлегацыі дэпутаты палаты прадстаўнікоў і палаты саветнікаў ад ліберальна-дэмакратычнай і сацыялістычнай партый.

На Мінскім аэрадроме, упрыгожаным дзяржаўнымі флагамі СССР, Японіі і БССР, гасцей сустракалі кіраўнікі ўрада рэспублікі і шматлікія прадстаўнікі Мінска.

Піянеры падносяць гасцям букеты кветак. Гасцей сардэчна вітаў Старшыня Вярхоўнага Савета БССР В. Ф. Шаура. Са словам у адказ ад імя групы парламентарыяў выступіў Сігэо Танака.

Неўзабаве пасля прыбыцця дэлегацыя нанесла візіт Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В. І. Казлову. Гутарка праходзіла ў цёплай дружалюбнай абстаноўцы. Японскія госці з вялікай цікавасцю слухалі расказ аб развіцці эканомікі і культуры Беларусі.

У канцы гутаркі кіраўнік дэлегацыі Сігэо Танака заявіў, што японскія парламентарыі прыкладуць усе намаганні для развіцця і ўмацавання дружбы паміж народамі Савецкага Саюза і Японіі.

Затым японскія госці зрабілі паездку па горадзе. Яны агледзелі помнік Уладзіміру Ільічу Леніну на плошчы, якая носіць яго імя, будынкі на Ленінскім праспекце. Члены дэлегацыі зрабілі прыпынак на плошчы Перамогі. Мінутным маўчаннем яны ўшанавалі памяць воінаў і партызан, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і ўсклалі вянок ля падножжа помніка-абеліска.

Члены дэлегацыі агледзелі жылыя дамы ў мікрараёне Волгаградскай вуліцы, пабывалі ў жылых кварталах, дзе жывуць работнікі Мінскага гадзіннікавага, трактарнага заводаў, паліграфічнага камбіната імя Якуба Коласа і іншых прадпрыемстваў.

Японскія парламентарыі пабывалі таксама ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

На здымку: госці з Японіі на вуліцах беларускай сталіцы.

ТАМ, АЗЕ ЗАГІНУЎ КРЫЛАТЫ ГЕРОЙ



Помнік герою-лётчыку Мікалаю Гастэлу паблізу Радашковіч.

СВЕТЛЫМ ШЛЯХАМ

ТВОРЧАЯ камандзіроўка прывяла мяне ў Пінск. Да Малоткавіч адгэтуль—рукой падаць. Дай, думаю, загляну да Марка Герасімавіча Піскуна, свайго даўняга баявога сябра, які старшынствуе ў калгасе імя Суворава. Піскун — былы падпольшчык. Калісьці паны прыгаварылі яго да васьмі год турмы. У час вайны ўдзельнічаў у гераічнай абароне Брэсцкай крэпасці, быў адважным партызанам. Мой сябра выбіраўся дэпутатам у парламент рэспублікі, а цяпер — дэпутат абласнога Савета. Марк Піскун сам папрасіўся ў родныя мясціны падымаць грамадскую гаспадарку, і ўжо каторы год яго арцель на Піншчыне ідзе разам з перадавымі.

І вось я ў доме Марка Піскуна. Марта Васільеўна, яго маці, завіхаецца ля печы:

— Э-э, саколік, спазніўся! Цяпер давядзецца чакаць да ночы. Ен рана ўстае, — гаворыць яна пра сына. — Час цяпер гарачы, хлеб убіраем. А калгас вялікі, траха не трыццаць вёрст удаўжкі ды гэтулькі ўшыркі.

Марта Васільеўна кліча сваіх унукаў снедаць, запрашае і мяне на мачанне з блінамі. Сядаю за стол з дзецьмі. Іх двое — Міхась і Ірынка.

Цікаўлюся, кім хоча быць Ірына.

— Мне яшчэ год вучыцца, — гаворыць дзяўчына. — А спецыяльнасць у школе набываю. Аказваецца, Ірына разам з атэстатам сталасці атрымае пасведчанне жывёлавода. Умее вадзіць і трактар. Мяркуе падацца ў сельскагаспадарчую акадэмію.

— Мне і не снілася, што мая ўнучка будзе кіраваць машынай, — заўважае Марта Васільеўна.

НАД ПІНАЙ

Дарожныя нататкі

— Трактар вадзіць! Вось каб на ракеце паляцець, — умяшаўся ў размову Міхась. — Вось тады дзіва было б.

— Да чаго пінчукі дажыліся, падавай ім Месяц з неба!— жартуе Марта Васільеўна, а затым, уздыхнуўшы: — Я ў такія гады нават лыкавага лапця не мела, так ніводнай пары і не знасіла — усё лазовікі. Лыка ж трэба было купіць...

Дзякую гаспадыні за смачны сняданак і прысадамі іду за вёску, дзе пачынаецца поле. Яравыя ўрадзілі добра. Ды як не ўрадзіць на гэтых тарфяніках!

Іду палеткам, любуюся плёнам працы калгаснікаў і нават не заўважаю, як па дарозе прашмыгнуў старшынёўскі «газік». А затым прыпыніўся.

— О! Каго бачу! — чую голас сябра. — Здароў, браток! Здароў!

Прыселі на абочыне дарогі. Спачатку ішло «як жывеш?», а затым «што новага чуваць?». Я пра калгас цікаўлюся, заўважаю, як Малоткавічы растуць.

— Дзіва што растуць, ты ж гадоў пяць не быў тут.

І старшыня пачынае пералічваць:

— Лесазавод, рамонтна-механічная майстэрня, сталярны цэх, млын, воўнаачоска, узвялі чатыры школы, прабілі тры шчыліны, з якіх ваду падаём у воданапорную вежу, а адтуль — на фермы. І шмат яшчэ чаго зроблена... А за апошнія чатыры? Тры кароўнікі, два цялятнікі і свінарнік. Будуемся, браток, будуемся!..

...Амаль два дні я гасцяваў у свайго сябра, бываў на калгасных палетках і сенажацях. Марк Герасімавіч не столькі паказваў гаспадарку, як знаёміў з людзьмі. З кім толькі не пазнаёміўся! І з лепшай свінаркай Верай Шпень, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, і з загадчыцай фермы Аленай Яруціч. Скончыла дзяўчына Пінскі заатэхнікум. Дыплом атрымала з адзнакай выдатніка. А цяпер паступае ў сельскагаспадарчую акадэмію на завочнае аддзяленне. Святлана Новак, загадчыца фермы буйнай рагатай жывёлы, таксама будзе паступаць на завочнае ў акадэмію.

Словам, расце калгас, растуць людзі, цудоўныя, шчырыя, працавітыя.

Алесь МАХНАЧ.

НА РОЗНЫХ МОВАХ

Вялікую цікавасць да жыцця народаў зарубежных краін праяўляюць жыхары Жлобінскага раёна. Яны ахвотна выпісваюць газеты і часопісы на нямецкай, англійскай, французскай, іспанскай і многіх іншых мовах. У раёне ў жніўні месяцы была афармлена падпіска на 133 часопісы і 8 газет на замежных мовах.

Сегодня в номере

ДЛЯ ТЕХ, КТО НЕ ЧИТАЕТ ПО-БЕЛОРУССКИ

Сегодняшний номер нашей газеты в основном посвящен 25 годовщине воссоединения Белоруссии в единой Белорусской Советской Социалистической Республике. Этому знаменательному событию в жизни нашего народа посвящена и передовая статья «СВЕТЛЫМ ШЛЯХАМ». Нищим и бесправным краем была Западная Белоруссия до 1939 года. Бедняки-крестьяне были в полной зависимости у польского помещика, рабочий в городе—у хозяина. Обездоленные люди, слыша слова вербовщиков о заморском «рае», снимались с насиженных мест, покидали родных и близких, уезжали в Канаду, Америку, Аргентину, надеясь найти там спасение от нищеты.

В 1939 году, когда гитлеровская Германия напала на Польшу, Красная Армия перешла границу и взяла братьев-белорусов под свою защиту. Но свобода была недолгой. В 1941 году на Советский Союз напали полчища Гитлера. Но вот окончилась война, и всего только за двадцать послевоенных лет расцвели бывшие «усходнія крэсы». Брест, Гродно, Барановичи, Волковыск, Слоним стали большими советскими городами с множеством новостроек, развитой промышленностью.

Щедрая осень в этом году в Белоруссии. Много радости принесла она колхозникам сельскохозяйственной артели имени Чапаева Глубокского района (репортаж «ВОСЕНЬ У ВЕРХНІМ». 2 стр.). В этом коллективном хозяйстве четыре тысячи гектаров бывшей панской земли. 430 семей бывших бедняков пользуются ею. Они посадили большой фруктовый сад, который дает богатый урожай яблок, вырастили сады возле каждого колхозного дома. Там, где было болото, бушует кукуруза, с каждого гектара земли собрано по 20 центнеров зерна. В селе много новых красивых кирпичных домов, а скоро здесь начнут строить двухэтажные, будет новый дом культуры, детский сад. Вместе с двумя соседними хозяйствами колхоз собирается строить на озере Заплисье дом отдыха.

Белорусский писатель Алесь Махнач в путевых заметках «НАД ПІНАЙ» (3 стр.) рассказывает еще об одном уголке бывшей Западной Белоруссии — деревне Молотковичи, недалеко от Пинска. Председателем колхоза там работает боевой товарищ Махнача Марк Герасимович Пискун. Пискун — депутат областного Совета, хозяйство его одно из передовых. Всего пять лет не был автор в этих местах, а перемены произошли здесь большие. Построили колхозники лесозавод, ремонтно-механические мастерские, столярный цех, четыре школы. И люди, которые трудятся в этом колхозе, замечательные.

«СЯМЁН ШЭЙПА: ПА ТОЙ ЖА ЗЯМЛІ ХАДЖУ, А ЎСЁ НОВАЕ» (4 стр).—так называется очерк об одном из наших земляков из Канады, приехавшем на Родину, Семене Андреевиче Шейпе. Более тридцати лет не был он в Слониме, в родной деревне Вороничи, откуда уехал когда-то на заработки.. «Как будто по той же земле хожу, а все новое», — говорит гость о Слониме. Да, за послевоенные годы город стал промышленным. Здесь выросло несколько фабрик, построены целые кварталы новых жилых домов. У Семена Андреевича много племянников. Все они окончили школу, многие учатся в институтах, техникумах. В Вороничах Семен Андреевич осмотрел колхозное хозяйство и остался доволен. Деревня помолодела, обновилась. На полях работают различные машины, для скота построены кирпичные коровники и свинарники. Семен Андреевич, побывав в нашей стране, сам увидел, что достижения, о которых пишут советские газеты, не пропаганда, а действительность.

Григорий Нехай, белорусский писатель, обращается через газету «Голас Радзімы» к своему бывшему другу Масею Седневу с вопросом: «ЦІ ЁСЦЬ У ЦЯБЕ ХОЦЬ КРОПЛЯ СУМЛЕННЯ?» (6 стр.). Когда-то этот человек учился в советской школе, в советском институте. Но вот началась война, и он оказался во вражеском стане. Своими стихами он приветствовал приход фашистов на нашу землю, пел гимн варварам, которые не щадили гениальных творений Гете, Шиллера, Лессинга, Гейне...

А в это время десятки белорусских писателей-патриотов сражались в рядах Советской Армии, в партизанских отрядах, боролись с врагом своими пламенными произведениями. Фашисты сожгли белорусские деревни, разрушили Минск. «Ты, наверно, помнишь, — обращается Григорий Нехай к Седневу, — каким ты оставил Минск, когда удирал вместе с фашистами от Советской Армии. Только развалины и битый кирпич». Эти раны давно залечены. Минск стал красивым новым городом, вызывающим восхищение у многочисленных зарубежных туристов.

Разошлись дороги Григория Нехая и Масея Седнева. Не принесли Седневу «зари свободы» крылья фашистского воронья. Навсегда подбиты они и никогда не закрыть им больше нашего чистого неба.

Скоро библиотечка газеты «Голас Радзімы» пополнится очередной брошюрой «У КРАІ РОДНЫХ БЯРОЗ». О ней рассказывает заметка на 8 стр. под таким же названием.

В сегодняшнем номере напечатано также много небольших информаций, рассказывающих о достижениях промышленности бывшей Западной Белоруссии, о культурном строительстве в этих районах.



Пагрузачная пляцоўка Мінскага аўтамабільнага завода. Адсюль МАЗы ідуць на будаўнічыя пляцоўкі нашай рэспублікі, краіны і за мяжу.

Фота **Ул. Кітаса.**

Пішуць землякі

Конец войны застал меня в Германии, в американской зоне оккупации. Долгое время был без работы. И вот однажды всех безработных собрали на бирже труда, а потом погрузили на пароход и повезли в Америку. Помню одного поляка из Варшавской Праги по имени Ян. Он всю дорогу восхищался американским образом жизни.

И вот привезли нас в южные штаты. Сразу же возле нас появились «рабовладельцы» — пузатые капиталисты. Отправили нас на каменоломни. И здесь мы увидели то, что можно было увидеть во время войны в лагерях гитлеровцев. Наш американский шеф заставлял негров возить на себе огромные каменные глыбы. А от меня потребовал, чтобы я подгонял их. Я отказался. Поляк Ян от недоедания заболел и вскоре умер. Так и не заработал он желанных долларов в «слынном» краю — Америке.

Мне пришлось долго скитаться и голодать в Соединенных Штатах. Видел собственными глазами, как живут безработные американцы. Я начал требовать, чтобы меня отправили на Родину. Но этой мечте не суждено было сбыться...

Г. С

ФРГ.

* * *

Вельмі вам дзякую за пасылкі з кнігамі. Кнігі ў мяне расхватваюць нашы суродзічы. Некаторыя зачытваюць, як кажуць, на смерць, а многія як пойдуць з рук у рукі, так назад і не вернуцца. Таму я стараюся сам перш прачытаць, а пасля даю іншым.

...Няхай мне і вока вон, але я мушу старое ўспомніць. Я, як паеду ў бібліятэку, люблю пачытаць у «Известиях» артыкулы пад рубрыкай «Змагары за вялікую справу». Вось прачытаў артыкул аб Галадзеду. Абавязак кожнага сумленнага чалавека — выкрываць рэшткі культу асобы пры любой аказіі, каб перасцерагчы народ ад паўтарэння памылак.

Я. С.

ЗША.

НАВІНЫ З ЛІДЫ

* Амаль кожны месяц на Лідскім заводзе электравырабаў нараджаюцца новыя віды прадукцыі. Толькі ў жніўні тут асвоены і запушчаны ў серыйную вытворчасць бытавыя свяцільнікі трох тыпаў. Гэта падвесныя мадэлі сучаснай прыгожай формы.

* Новы трохпавярховы будынак вырас у цэнтры горада Ліды. Пакуль што ў ім гаспадараць сталяры, сантэхнікі, муляры. У хуткім часе тут справяць наваселле навучэнцы палітэхнікума.

* На Лідскім заводзе сельгасмашын запушчан у серыйную вытворчасць новы кормапрыгатавальны агрэгат «КН-3». Гэта — набор розных машын: каўшовы транспарцёр, бульбамыйка, запарны чан, мялка-змяшальнік, раздатчык. Дзейнічае ён няспынна, як адзіная механізаваная лінія, і за гадзіну можа падрыхтаваць больш як 5 тон кармавых сумесей.



На здымку: Савецкая вуліца ў Лідзе.

С. ШЭЙПА: «Па той жа зямлі хаджу, а ўсё новае»

Я ЕХАЛА ў вёску Варонічы, якая знаходзіцца недалёка ад Слоніма, каб сустрэцца з Сямёнам Андрэевічам Шэйпам, нашым земляком з Канады. Дабрацца да Вароніч няцяжка: аўтобусы туды ходзяць часта, час у мяне быў, і, перш чым ехаць у вёску, я вырашыла хоць трошкі пазнаёміцца са Слонімам, таму што раней тут бываць мне не даводзілася. Мясцовыя жыхары жартам называюць свой горад Венецыяй. Гэту асацыяцыю, напэўна, выклікае багацце вады, мноства мастоў, перакінутых праз Шчару і яе прытокі. Яшчэ некалькі год — і каля горада пройдзе канал, які па Дняпры і Нёмане злучыць Балтыйскае мора з Чорным. Слонім — сучасны прамысловы горад са шматлікімі новабудоўлямі, вежавымі кранамі, высокімі комінамі фабрык і заводаў. У цэнтры — сквер, прыгожыя будынкі адміністрацыйных устаноў, камфартабельная гасцініца «Шчара». Вось каля гэтай гасцініцы я і сустрэлася з Сямёнам Андрэевічам, так і не даехаўшы да Вароніч.

— А вы яшчэ аказваецца памятаеце пра мяне, — усміхнуўся ён. — Мы ж усяго некалькі дзён былі знаёмы.

Я сустракалася з Шэйпам у Мінску, дзе ён быў з дэлегацыяй Федэрацыі рускіх канадцаў. Беларуская сталіца спадабалася госцю. «Каб у мяне спыталі, у якім горадзе я хачу жыць, — гаварыў Сямён Андрэевіч, — я адказаў бы: у Мінску».

НАВЕДАЎШЫ Маскву, Волгаград, Ялту, Адэсу, Севастопаль, Шэйпа прыехаў у свае родныя мясціны на Слонімшчыну. Сваякоў у яго аказалася так многа, што і за месяц ён не змог іх усіх аб'ехаць.

Якраз у той дзень, калі я сустрэла яго, Шэйпа гасціў у сына сястры Антаніны Івана Ільіча Дабрыяна. Сямён Андрэевіч прапанаваў мне зайсці да пляменніка.

— Хадземце, паглядзіце, як жывуць мае сваякі, там і пагаворым... Я сёння хадзіў да старшыні гарадскога Савета, прасіў, каб мне паказалі горад, расказалі аб ім. Нічога пазнаць не магу. Па тых жа вуліцах хаджу, а ўсё новае. На плошчы, дзе цяпер вялікі двухпавярховы універмаг, быў базар, гразь, шум. А гэта ж плошча лічылася тады лепшай у горадзе. Зараз рынак перанеслі ў больш зручнае месца, а тут сквер разбілі. Мне расказвалі, што ў Слоніме пабудавана кардонная фабрыка, мэблевая, тэкстыльная, шынарамонтны завод, мясакамбінат, завод сухога малака. І гэта ў Слоніме! Абавязкова пабываю ўсюды сам...

ТЫМ часам мы прыйшлі на вуліцу Карла Маркса, дзе жыве Іван Дабрыян. Першай сустрэла нас Іванава дачка Іра, прыгожая дзяўчынка з доўгай чорнай касой. Яна займаецца ў дзевятым класе сярэдняй школы і ў чацвёртым класе музычнай. Сямён Андрэевіч глядзіць на яе неяк асабліва ласкава — дзяўчынка пакарыла яго сваёй цудоўнай ігрой на акардэоне.

— Іра нам сыграе сёння, — гаворыць ён. — Вы паслухаеце, які яна музыкант. А колькі песень ведае! Я часта прашу яе, каб яна пайграла мне. І ў такія хвіліны заўсёды ўспамінаю, як праводзілі мяне з дому на заработкі ў Канаду.

Сямён Андрэевіч усміхнуўся і пакруціў галавой.

— Бацькам хацелася наладзіць провады па-добраму, з гарэлкай, з музыкай. Запрасілі вясковага гарманіста. Быў пост, а пастом слухаць музыку лічылася грахом, і калі на галаву музыканту выпадкова звалілася ікона святога Міколы, бацька рашыў, што цяпер трэба чакаць боскай кары. За вёску вывелі мяне з плачам. Смешна і сумна ўсё гэта ўспамінаць. Вось і гляджу я на Іру з радасцю. Музыка заўсёды прыносіць радасць.

На чужыне мне не шанцавала. Можа святы Мікола цудатворац у гэтым быў вінаваты, можа яшчэ якая прычына. Вы, мусіць, ужо не раз чулі, які горкі лёс, беспрацоўе кідалі рускіх, беларускіх, украінскіх эмігрантаў па розных краінах. Я працаваў на нізкааплачваемай рабоце і быў шчаслівы, калі яна была. Пераязджаў з горада ў горад, з фермы на ферму. Мне 59 год, а я адзін, ні жонкі, ні дзяцей. У мяне часта тут пытаюць, чаму так здарылася. А што тут адкажаш! Калі мне адмаўлялі ў рабоце (а гэта здаралася часта), я браў торбу, садзіўся ў таварны вагон і ехаў далей. І рады быў, што адзін. Хіба ж мог я жонку вось так вазіць усюды за сабой? Бадай адзінай радасцю ў гэтым жыцці была грамадская работа, яна прыносіла асалоду. Потым уступіў у рабоча-фермерскі клуб імя Горкага. А калі пачалася вайна, стаў членам Камітэта дапамогі Радзіме.

Мы збіралі грошы, цёплыя рэчы. Праз Чырвоны Крыж і праз свой Камітэт адпраўлялі на Радзіму. Горад Ванкувер, дзе я жыву, дапамагаў Адэсе. Сёлета мне пашчаслівілася пабываць у горадзе-герое. І слухаючы аб яго подзвігу, я думаў: можа ў яго легендарнай перамозе ёсць, няхай маленькая, але ўсё ж часцінка і нашай працы.

ПАКУЛЬ мы вялі размову, гаспадыня прыгатавала вячэру, запрасіла да стала. Марыя Іванаўна частуе ад шчырага сэрца. На стале каўбаса, агуркі, памідоры, мяса, самаробная налівка. Потым гаспадыня прынесла грушы і яблыкі са свайго саду, потым мёд ад уласных пчол, потым... Адмаўляцца нельга, таму што Марыя Іванаўна прымала гэта як крыўду.

— Я тут губляю спартыўную форму, — жартуе Сямён Андрэевіч. — А гавораць, што ў Савецкім Саюзе людзі з голаду пухнуць.

...Многа чаго гавораць аб нашай краіне на Захадзе. Вось чаму Шэйпа хоча разабрацца ва ўсім сам. Ён не проста здзіўляецца вялікім пераменам, якія адбыліся на яго Радзіме, усё, што сустракаецца яму, ён дэталёва вывучае, параўноўвае, аб усім дапытваецца, старанна заносіць у запісныя кніжкі. Ён хоча зразумець наша жыццё, наш лад.

— У мяне ў Канадзе ёсць знаёмы Сцяпан Кенда. У Слоніме жыве яго ўнучка. Яна пісала, што жыве добра, але стары Кенда не ведае, ці так гэта. Ён прасіў убачыцца з ёй, распытаць і даведацца — можа ёсць сэнс вярнуцца дадому. Бачыўся я з Нінай Кенда, пазнаёміўся, перадаў паклон ад дзеда. Праўду пісала яна аб сабе. Скончыла дзяўчына медыцынскі інстытут, працуе ў Слонімскай паліклініцы. Дзеду свайму перадала: няхай прыязджае.

СЯМЁН Андрэевіч, а як жа вашы Варонічы? Родных, вы казалі, у вас там многа, як яны жывуць?

— Як прыехаў у вёску, столькі народу выйшла мяне сустракаць, што разгубіўся. З гадзіну, мабыць, знаёміўся. У сястры Веры трынаццаць дзяцей. Як жа ты іх выгадавала, пытаюся. А яна смяецца: «Я ж на кожнага з іх грошы атрымліваю. Пасля дзесятага, на кожнае дзіця пры нараджэнні 250 рублёў даюць, а потым на кожнага па 15 рублёў у месяц. Я нават ордэн маю за свае мацярынскія клопаты».

Калісьці ў Веры з мужам было тры гектары зямлі. Як бы падзялілі яны іх паміж сваімі сынамі, колькі б маглі яны даць за дочкамі ў пасаг? А зараз такое пытанне іх не хвалюе. Дзеці ўсе вывучыліся, хто ў вёсцы застаўся, хто ў горад паехаў. Дачка брата Васіля Валя вучыцца ў педінстытуце, пляменнік працуе выкладчыкам у Жыровіцкім сельскагаспадарчым тэхнікуме.

У Варонічах я сам абыйшоў палі, фермы, доўга аб усім распытваў старшыню калгаса. Мала чым нагадвае гэтая новая вёска тую, што пакінуў я пры панах. Даўно ссяліліся з хутароў сяляне-аднаасобнікі. Варонічы абнавіліся, разбудаваліся. Мне паказвалі цагляныя свінарнікі, сельскагаспадарчыя машыны. Як убачыў я поле, успомніў сваю маладосць, рукі самі пацягнуліся да работы, узяўся салому вазіць.

...У пакоі ўжо запалілі святло, гаспадыня прынесла чай, а Сямён Андрэевіч усё гаварыў і гаварыў. І я ўявіла, як прыедзе ён у Канаду, збяруцца ў сваім клубе эмігранты, людзі, якіх горкі лёс закінуў так далёка ад Радзімы. З якой увагай будуць слухаць яны расказ аб нашай вялікай краіне, аб чым і абяцаў расказаць ім наш зямляк.

Д. БАБАК.

СВЕТЛЫМ ШЛЯХАМ

Нядаўна сваю родную вёску Пляцешы, што на Мядзельшчыне, наведаў наш зямляк са Швецыі Канстанцін Жыткевіч з жонкай Эльсай. Яны правялі месяц у гасцінных сваякоў, адпачывалі на берагах блакітнага возера Нарач, любаваліся сваёй абноўленай зямлёй.

НА ЗДЫМКУ: Канстанцін і Эльса ЖЫТКЕВІЧ ў час наведвання Мядзельскай раённай бальніцы гутарыць з хірургам Леанідам НЯВЕРАМ (справа).

Фота М. Чарняўскага.

ЗНІКАЮЦЬ АПОШНІЯ ХУТАРЫ

ІЎЕ. Вацлаў Пяцькан — жыхар Лялюкінскіх хутароў — даўно марыў пераехаць у вёску. Сёлета ён пакінуў хутар і пасяліўся ў вёсцы Лялюкі — цэнтры калгаса «Ленінскі шлях». Сюды пераехаў і брат Вацлава — Іосіф. Сельсавет дапамог ім будаўнічымі матэрыяламі, калгас выдзеліў неабходны транспарт і рабочую сілу для перавозкі дамоў.

Толькі ў гэтым годзе назаўсёды развіталіся з хутарамі каля 30 сем'яў калгаснікаў, якія жывуць на тэрыторыі Лялюкінскага сельсавета. У вёску Навасёлкі пры дапамозе калгаса пераехалі сем'і хлебаробаў Станіслава Аляхновіча, Мар'яна Касцюка, Антона Уса, у вёску Байрашы — Іосіфа Жалдака, Іосіфа і Вікенція Святохаў і многіх іншых.

САМАЛЁТ НАД ХМЫЗНЯКАМІ

БРЭСТ. Самалёты сельскагаспадарчай авіяцыі штодзённа кружаць над палямі калгасаў і саўгасаў Брэстчыны. 160 тысяч гектараў пасеваў падкармілі яны сёлета мінеральнымі ўгнаеннямі, на вялікіх плошчах правялі хімічную праполку.

Гарачы час у авіятараў цяпер. Пілоты Вячаслаў Новікаў і Уладзімір Багдановіч знішчаюць ядахімікатамі хмызняк на лугах і пашы Баранавіцкага вытворчага ўпраўлення. У эксперыментальнай базе «Вольна-Чарніхова», саўгасе «Гарадзішчанскі» яны адваявалі паўтысячы гектара лугоў.

НАД ПРЫПЯЦЦЮ НОВАБУДОЎЛІ

МАЗЫР. Тут пабудавана новае трохпавярховае памяшканне універмага. Цяпер у ім манціруецца гандлёвае абсталяванне. Неўзабаве універмаг прыме першых пакупнікоў.

Шырокі размах набыло і жыллёвае будаўніцтва. Па вуліцах Савецкай і Леніна заканчваецца будаўніцтва пяціпавярховых дамоў. Неўзабаве справяць наваселле 32 сем'і, якія будуюць дом кааператыўным метадам.

На будучы год запланавана будаўніцтва новай школы на 964 месцы па Інтэрнацыянальнай вуліцы, новай гасцініцы, механізаванай пральні, базы звадкаванага паліва і многіх іншых аб'ектаў.

НА ПЯЦЬ ДЗЁН РАНЕЙ

БЕЛААЗЁРСК. На пяць дзён раней устаноўленага тэрміну здадзен пад гідраўлічнае выпрабаванне чарговы праматочны кацёл.

За выключна кароткі тэрмін зманціравана звыш паўтары тысячы тон металаканструкцый.

У РЫБГАСЕ «ЛАХВА»

ЛУНІНЕЦ. Многа каштоўнай прадукцыі дае дзяржаве рыбгас «Лахва» Лунінецкага раёна. У яго азёрах разводзяць серабрыстага карпа і дзесяткі тысяч вадаплаўных качак. Памяшканні для вырошчвання і адкорму качак механізаваны. Сёлета ў рыбгасе адкормлена ўжо каля 80 тысяч качак і прададзена дзяржаве 1 470 цэнтнераў птушынага мяса — значна больш плана. Па ўлову рыбы рыбгас выйшаў на другое месца ў рэспубліцы і ўзнагароджан грашовай прэміяй.

КАЛГАСНАЯ ГАЛЕРЭЯ

НАВАГРУДАК. На другім паверсе клуба калгаса «Вялікі Кастрычнік» размясцілася карцінная галерэя. Гэта — падарунак Гродзенскага абласнога гісторыка-краязнаўчага музея аднаму з лепшых калгасных клубаў вобласці. Прыцягваюць увагу наведвальнікаў эцюд рабочага В. Сеўрука «Вясна», карціна Г. Пушкова «Саўгас Станіславава», эцюд Папова «Смерць, але не рабства». Тут жа выстаўлены скульптурныя творы.

Сяўба азімых на Брэстчыне.

СВЕТЛЫМ ШЛЯХАМ

Фабрыкай мяса і яек называюць Мастоўскую міжкалгасную птушкаферму. Зараз тут налічваецца звыш 30 тысяч штук птушкі.

НА ЗДЫМКУ: лепшыя птушніцы фермы Станіслава ШЧЭРЖЭНЯ і Марыя ПАЛУБЯТКА.

Фота **З. Брука.**

Гэтую дзяўчынку завуць Галя. Жыве яна ў адной з вёсак пад Гроднам. Паглядзіце, які прыгожы ў яе твар, якая ўсмешка. Хораша і радасна ў яе на душы, хутка Галя пойдзе ў школу.

ПРЫГОЖАЕ — У БЫТ

Да 80 навінак са шкла штогод паяўляецца на паліцах нашых магазінаў. Вырабы шклозаводаў «Нёман», імя Дзяржынскага, «Кастрычнік» набылі свой мастацкі стыль і высока ацэньваюцца на міжрэспубліканскіх і міжнародных выстаўках і кірмашах, карыстаюцца добрым попытам у Англіі, Канадзе, Германіі і іншых краінах свету.

У параўнанні з першым годам сямігодкі выпуск у рэспубліцы гатунковай шкляной пасуды ўзрос больш чым на 35 мільёнаў штук. Беларусь цяпер займае трэцяе месца ў Саюзе па яе вытворчасці.

Паспяхова развіваецца і вытворчасць сувеніраў. Цяпер выпускаецца цэлая серыя арыгінальных вазачак, забаўных фігурак жывёлін і птушак.

ВІЗІТ ДА ТАМАНЦАЎ

Бельгійскі журналіст Жан Марыс Шав'е аб наведанні адной з часцей Савецкай Арміі

Што можа быць больш падобна адно на другое, чым дзве армейскія казармы, незалежна ад таго, да якога яны тыпу адносяцца, пад чым небам знаходзяцца? Таму можа здацца дзіўным, для чаго я раскажу аб адной з іх, якая размешчана непадалёку ад Масквы і якую я нядаўна наведаў.

Але калі вы прачытаеце гэтую справаздачу, я думаю, што вы зразумееце, для чаго.

Часці Таманскай дывізіі патанаюць у акіяне зеляніны. Гэта цудоўная мясцовасць. Праўда, Вялікая Масква сваімі будаўнічымі пляцоўкамі ўрываецца сюды, апаясвае пустэчы, узбіраецца на ўзгоркі і абстаўляе магістралі акуратнымі радамі дамоў.

Нас вітаў генерал-маёр Валошын. Яму сорак. У мінулым камсамолец, удзельнічаў у вайне супраць фашызму, дайшоў да самай Прагі.

Кажуць, што параўнанні не заўсёды добрыя. Магчыма гэта і так, і тым не менш я не мог не ўспомніць аб армейскіх казармах у маёй краіне, дзе ў атмасферы антысавецкай нянавісці і маральнага анямення маладых людзей вучаць вядзенню вайны супраць рускіх.

Таманская дывізія была сфарміравана на базе некалькіх палкоў, якія храбра змагаліся ў час Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі 1917 года. Імя сваё яна атрымала ад Таманскага паўвострава, дзе 16 000 яе салдат пакрылі сябе легендарнай славай у барацьбе з фашыстамі ў кастрычніку 1943 года. Гісторыя яе створана не арыстакратычнымі генераламі або жорсткімі заваявальнікамі. Гэта гісторыя ахвяраў, якія прынесены простымі людзьмі, што служаць справе народа. Сёння традыцыя працягваецца. Савецкая Армія застаецца аплотам рэвалюцыі і прагрэсу, аплотам міру, што, безумоўна, не можа не ўлічвацца імперыялістамі.

Вы можаце зразумець прыроду і задачы гэтай арміі, калі вы вывучыце праграму ваеннай падрыхтоўкі салдат і іх выхавання ў духу патрыятызму і грамадзянскага абавязку. Вы не ўбачыце палкіх плакатаў у іх класах, на якіх нахабна ўсміхаючаяся фізіяномія парашутыста-забойцы шумна рэкламуе моладзі «хараство вайны». Наадварот, вы знойдзеце тут розныя вучэбныя плакаты і брашуры, пачуеце лекцыі аб міжнароднай дружбе і салідарнасці працоўных усяго свету.

Я бачыў многа фотавітрын, якія расказваюць аб вядомых бітвах у Германіі, Францыі, Японіі і іншых краінах; аб масавых дэманстрацыях і маршах, што патрабуюць забароны атамнай зброі. Ці можна сустрэць штонебудзь падобнае ў казармах заходнееўрапейскіх армій?

У іх ідэальная дысцыпліна, але не якогасьці прымусовага тыпу, а заснаваная на свядомасці — адзін салдат сказаў мне аб гэтым. У выніку тут няма граніцы паміж арміяй і насельніцтвам, няма абмежавання ад сацыяльнай рэчаіснасці, што наглядаецца ў заходніх арміях.

Салдаты Таманскай дывізіі вельмі часта змяняюць танкі на ўборачныя камбайны, а вінтоўкі — на вілы ў час уборачнай кампаніі. Яны ўдзельнічаюць у палявых работах поплеч з калгаснікамі ў адзінаццаці сельскагаспадарчых кааператывах Маскоўскай вобласці, над якімі яны шэфствуюць.

Што яшчэ можа больш садзейнічаць дружбе паміж арміяй і насельніцтвам, чым мірная праца, у якой увасоблены агульнасць інтарэсаў і мэт. Няма нічога дзіўнага, што асаблівая ўвага ўдзяляецца прафесіянальнай адукацыі салдат і нават іх падрыхтоўцы ў спецыяльных групах з тым, каб яны ў будучым маглі паспяхова займацца ў вну.

Так абстаяць справы ў Таманскай дывізіі, якую ніхто не пакідае без спецыяльнасці.

Велізарная ўвага таксама ўдзяляецца культурна-масавай рабоце. Дом афіцэраў, якім кіруе Савет салдат і афіцэраў, праводзіць культурныя мерапрыемствы ва ўсіх падраздзяленнях. Яны ставяць п'есы (ёсць зала на 650 месц), даюць канцэрты ў палках, чытаюць лекцыі і даклады, паказваюць фільмы і г. д.

У цэнтральнай бібліятэцы дывізіі (у кожным палку ёсць свае бібліятэкі) 25 000 кніг. Я бачыў каталаг: Ленін, навуковая літаратура, Гюго, Бальзак, Горкі і г. д. — усе тыя, каго рускія, як і ўвесь свет, лічаць вялікімі вучонымі, гуманістамі і пісьменнікамі. Гэта яшчэ адзін прыклад антымілітарызму — у бібліятэцы і на экране — у салдацкіх казармах.

Зразумела, мае ўражанні могуць здацца павярхоўнымі — мой візіт быў вельмі кароткім. Маё самае вялікае ўражанне, заснаванае на сапраўдных фактах, заключаецца ў тым, што армія і астатняя частка нацыі вельмі цесна звязаны адзін з адным, а гэта робіць салдата паўнацраўным грамадзянінам.

Галоўны «сакрэт» магутнасці Савецкай Арміі варта шукаць у самой прыродзе яе дзейнасці, у метадах ідэалагічнай і маральнай падрыхтоўкі яе асабовага складу. І гэты сакрэт уяўляе сабой якраз тое, чаго не ў стане правільна ацаніць стратэгі на Захадзе.

Пераклаў
Л. БАРАНОЎСКІ.

VISIT TO THE TAMAN DIVISION

By Jean Maurice Chauvier, Belgian Journalist

What can there be more alike than two army barracks no matter what kind and under whose sky? So it might seem strange if I tell you now about the one not far from Moscow which I recently visited.

But when you've read this account I think you'll understand why.

The units of the Taman Division were swamped in an ocean of greenery. An ideal countryside locality, you would say, if it were not for the onslaught of Greater Moscow whose construction sites overlap, wave after wave, the outlying wasteland, climb uphill and line highways in orderly rows.

We were welcomed by Maj. Gen. Voloshin. He is forty. A Komsomoler in his youth, he had fought staunchly in the anti-fascist war, marching as far as Prague.

People say comparisons are not always good. Maybe it is true, and yet I could not help thinking about the army barracks in my own country where amidst an atmosphere of anti-Soviet hatred and moral *torpidness* young men are being prepared for war against the Russians.

The Taman Division was formed on the basis of several regiments which had fought bravely in the 1917 October Socialist Revolution. Its name was derived from that of the Taman Peninsula where 16,000 of its soldiers brought it legendary fame fighting against the fascists in October 1943. Its history was not made by a gloomy gallery of aristocratic generals or cruel invaders. It is a story of selfsacrifices made by ordinary people, those who serve the ordinary people's cause. The tradition is being continued today. The Soviet Army remains the bulwark of the rovolution and progress, a bulwark of peace which is certainly taken into account by the imperialists.

You can understand the nature and tasks of this army if you have studied the programme for the military training of the soldiers and their education in a true spirit of patriotism and civil duty. You will not see inflammatory posters in their classrooms on which a brazenly smiling countenance of a paramurderer noisily advertises the «pleasures of war» to the youth. Instead you can find various educational posters and booklets, and hear talks delivered about international friendship and the solidarity of the world's working people.

I saw a number of photo expositions telling of popular struggle in Germany, France, Japan and other countries; about mass demonstrations and marches demanding a ban on atomic weapons. Is anything like this to be met in a West-European army barracks?

They have perfect discipline, not the unintelligent type but one based on consciousness — one of the soldiers told me this himself. Consequently, there is no gap between the army and the people generally, no separation from social reality, as is observed in Western armies.

Soldiers of the Taman Division often exchange their tanks and army trucks for combine harvesters and their rifles for the pitchfork during harvest time. They take part in field work shoulder to shoulder with farmers at eleven agricultural cooperatives in the Moscow Region, which they have undertaken to assist.

What can there be more conducive to friendship between an army and the people than peaceful labour in which the community of ideals and goals is expressed?

There is nothing surprising in the fact that particular attention is being paid to the professional training of the soldiers and even their preparation, in special groups, for future studies at higher schools.

This is what things are like in the Taman Division which no one leaves without a diploma.

Great attention is also being paid to raising cultural standards. The Officers' Club, which is run by a Council of Soldiers and Officers, organises cultural activities in all the units. They stage plays (there is an auditorium for 650 people), give concerts in the regiments, deliver lectures and reports, show films.

The Division's central library (separate libraries exist in each regiment) has 25,000 books. I saw the catalogue: Lenin, scientific literature, Hugo, Balzac, Gorky, etc.— all those whom the Russians and the world at large regard as great scientists, humanitarians and writers.

This is another example of anti-militarism — in the library and on the screen — in a military barracks.

Naturally, my impressions were necessarily superficial — my visit was short, and this demands humility. My overwhelming impression backed up by actual fact is that of close links between the army and the rest of the nation, which makes the soldier an all-round citizen.

The chief «secret» of the Soviet Army's might is to be sought in the very nature of its activities, in the standard of the ideological and moral training of its personnel. This secret is something of which strategists in the West are incapable of making a correct evaluation.

Артысты Беларускага танцавальнага ансамбля рыхтуюцца да выступлення.

Фота В. Бараноўскага.

СВЕТЛЫМ ШЛЯХАМ

ЮНЫЯ МУЗЫКАНТЫ

620 дзяцей рабочых і служачых горада Баранавічы адначасова з вучобай у агульнаадукацыйных школах наведваюць і музычную школу. 250 з іх займаюцца па класу фартэпіяна.

Для будучых музыкантаў бацькі набываюць піяніна. Толькі сёлета магазіны гарпрамгандлю прадалі каля сотні гэтых музычных інструментаў.

ГАСТРОЛІ, ВЫСТУПЛЕННІ

● Рускі драматычны тэатр імя М. Горкага пабываў на гастролях у Магілёўскай вобласці. Акрамя асноўнай сцэны, амаль кожны дзень артысты давалі выязныя спектаклі. Яны былі ў Быхаўскім, Чавускім, Бялыніцкім, Клімавіцкім, Касцюковіцкім і Краснапольскім раёнах.

● У другой палавіне жніўня Беларуская дзяржаўная філармонія наладзіла некалькі канцэртаў для працаўнікоў палёў Барысаўскага і Крупскага раёнаў. У калгасах імя Кутузава, «Чырвоная зорка», «Новае жыццё», імя Леніна, «Чырвоны Кастрычнік», «Камунар» і іншых выступілі спевакі — заслужаны артыст БССР Б. Макараў, лаўрэат Усесаюзнага фестывалю моладзі і студэнтаў С. Самсонаў, Н. Воранава, артысты арыгінальнага жанру Ігар і Мая Крапіны, баяніст С. Літоўка, чытальнік А. Паніхін і іншыя.

● У Іванаўскай вобласці 20 канцэртаў наладзіла эстрадная брыгада з удзелам заслужанай артысткі БССР Т. Пастунінай і чытальніцы Г. Рыжковай. Мінскія артысты выступалі ў раённых цэнтрах, калгасах і саўгасах вобласці.

● З поспехам прайшлі выступленні народнага артыста рэспублікі Зіновія Бабія ў Адэскім оперным тэатры. Ён выканаў вядучыя партыі ў операх «Рыгалета» (герцаг), «Тоска» (Каварадосі) і «Паяцы» (Каніо).

Сімфанічныя канцэрты з удзелам З. Бабія адбыліся таксама ў Кіславодску і Сочы. У Кіславодску — з сімфанічным аркестрам Саюза ССР пад кіраўніцтвам дырыжора А. Цюліна, а ў Сочы — з аркестрам Ленінградскай філармоніі З. Бабій выканаў папулярныя арыі з опер, рамансы і неапалітанскія песні.

Выступае адзін з калектываў мастацкай самадзейнасці Гродзеншчыны.

Фота Ул. Дагаева.



З АЦЭНКАЙ «ДОБРА»

Будаўнікі 36-га ўпраўлення здалі новы 80-кватэрны дом. Яго гаспадарамі сталі члены аднаго з кааператываў Першамайскага раёна Віцебска. У гэтым месяцы віцябляне атрымаюць яшчэ 200 кватэр.

Расце і добраўпарадкоўваецца горад беларускіх хімікаў — Наваполацк. Тут з'яўляюцца новыя вуліцы і мікрараёны. У горадзе — вялікае наваселле. Дзяржаўная камісія з ацэнкай «добра» прыняла два 60-кватэрныя жылыя дамы і маладзёжны інтэрнат на 310 месц.

ЦІ ЁСЦЬ У ЦЯБЕ ХОЦЬ КРОПЛЯ СУМЛЕННЯ?

Ліст да былога сябра

Я стаўлю перад сабой гэтае пытанне і не знаходжу адказу. Мне не зразумела, чаму вясковы хлапец, які з такой прагай імкнуўся да вучобы і вучыўся, як і тысячы такіх жа хлапцоў і дзяўчат, у савецкім інстытуце, успрымаў самую гуманную ў свеце культуру, а потым апынуўся ў стане ворагаў свайго народа.

Я звяртаюся да цябе, Масей Сяднёў. Я хачу пагаварыць з табой, як з былым сябрам. Зразумела, гісторыя — гэта строгі і бязлітасны суддзя. Яна кожнаму аддае сваё, хто што зарабіў. А гісторыя — гэта, у першую чаргу, народ. Ён і толькі ён мае права ацэньваць нашы паводзіны, нашу шчырасць, нашу любоў да таго, хто даў нам жыццё і на каго спадзяваўся, што ён будзе яму верным сынам. Інакш і быць не можа. І скажу табе праўду, як мяне абурылі твае «Лірычныя вершы», напісаныя ў гады часовай нямецка-фашысцкай акупацыі і апублікаваныя ў фашысцкай прэсе! Я прачытаў крытыку гэтых вершаў у адной з кніжак бібліятэчкі «Голасу Радзімы» і адразу не паверыў, што твая рука магла напісаць такія агідныя радкі.

Калі фашысцкія самалёты ляцелі бамбіць беларускія гарады і вёскі, у тым ліку, відаць, і тваю родную вёску, дзе жылі твае маці, бацька, браты і сёстры, ты пісаў:

Як радасць для сябе
я прывітаў
Радкоў маіх лірычнейшым
салютам...

Гэтак ты вітаў фашысцкія самалёты, што нішчылі тваю зямлю, змяталі з яе ўсё жывое. Хіба гэта не святатацтва?

Далей:

Маліўся сіле сонца агнявой
І дню, што лёс мой
перайначыў.
Я самалёту кожнаму над
галавой
Жадаў найлепшае удачы...
Як звязаныя ніцямі душы,
У лёце не гублялі яны згоды.
І крылле іх у сонечнай вышы
Гарэла водблескам маёй
свабоды.

Вось як! Ты жадаў фашыстам удачы ў знішчэнні тваёй маткі-зямлі, твайго народа! Прабач, гэта ўжо не лірыка. І ніякія танныя рубрыкі, закліканыя прывесці ў зман чытачоў, не схаваюць душы чалавека, які прадаў сваю радзіму ворагам-катам. Думаеш, ім твая паэзія патрэбна была? Яна была патрэбна толькі да пары да часу, каб абмануць народ, а там і ты стаў бы рабом акупантаў, кім, дарэчы, і быў, пакуль іх не разбілі і не выгналі з нашай зямлі. Дзе ім было да тваёй паэзіі, калі яны нават кнігі Гётэ і Шылера, Лесінга і Гейне палілі на кастрах. Але ж ты, згубіўшы годнасць сына свайго народа, хваліў іх, кланяўся прускаму боту, які не раз ужо таптаў нашу зямлю!

Затое не радаваліся твае былыя паплечнікі па пяру, пісьменнікі-патрыёты, якія засталіся вернымі Радзіме. Ты іх ведаеш. І, магчыма, ведаеш, што яны пісалі ў першыя ж дні вайны. Калі не чытаў ці забыўся, дык дазволь коратка напомніць. Вось што пісаў твой аднагодак у ліпені 1941 года, паэт, які толькі паўтара года пражыў пры Савецкай уладзе, а да гэтага пры панскай Польшчы хадзіў па турэмных этапах.

Настане дзень баёў апошніх!
Мы адступілі, каб было
Дзе легчы ворагу на пожнях,
Паросшых сіняй гавылой.
А мы шляхі вярнуцца
знойдзем,
Як вырай іх знаходзіць век,
Па сонцу, што на небе
ўзойдзе,
Па звону беларускіх рэк.

Гэта пісаў Максім Танк. А што ж пісалі твае былыя сябры па вучобе, па паэзіі?

Краіна мая, радасць мая,
Песня мая маладая!
Па нівах тваіх, па тваіх гаях
Сынава сэрца рыдае...
Топча, катуе тваю зямлю
Вылюдак ашалелы.
Я кроў да апошняе кроплі
пралью,
Каб толькі табе палягчэла...

Гэта радкі з вершаў Пімена Панчанкі.

А вершы і паэмы Аркадзя Куляшова, Петруся Броўкі, Пятра Глебкі, Анатоля Астрэйкі, Максіма Лужаніна і многіх іншых беларускіх паэтаў як старэйшага, так і малодшага пакалення! Якой любоўю яны былі прасякнуты да роднай зямлі, да свайго народа, які часова трапіў у фашысцкую няволю!

Больш таго, усе нашы паэты змагаліся з ворагам не толькі сілай мастацкага слова, але і са зброяй у руках. Пімен Панчанка быў ваенным карэспандэнтам, Алесь Бачыла працаваў у штабе арміі, Іван Грамовіч быў камандзірам зенітнай батарэі, збіваў тыя самалёты, якія на крыллях неслі табе «свабоду». Я быў камандзірам гаўбічнай батарэі. Анатоль Астрэйка двойчы пераходзіў лінію фронту, каб дапамагчы свайму народу змагацца з ворагам. Партызанам так спадабаліся яго вершы, што яны выдалі іх асобнай кніжкай у падпольнай партызанскай друкарні слуцкай газеты «Народны мсцівец». Кніжка называецца «Слуцкі пояс». Нядаўна яна была перавыдадзена і разыйшлася за некалькі дзён.

Я пералічыў у асноўным тых, хто друкаваўся ў калектыўным зборніку «Аднагодкі», які выйшаў з друку ў 1935 годзе пад рэдакцыяй Кузьмы Чорнага і Пятра Глебкі.

Выходзіць, што ты адзін застаўся на другім баку барыкад. Паганы ж ты выбраў сабе шлях. Горш не прыдумаеш.

Чаму гэта здарылася? Магчыма, запалохаў 1937 год? Так, гэта быў цяжкі год, калі ў сувязі з культам асобы было шмат невіноўных ахвяр. Але ж прычым тут народ? Як можна радавацца, што самалёты ворага палілі і нішчылі беларускія гарады, вёскі, скарбы культуры. На XX і XXII з'ездах наша партыя з усёй мужнасцю асудзіла тое дрэннае, што рабілася пры культе асобы. Аб гэтым ведае ўвесь свет. І тыя, што былі незаконна рэпрэсіраваны, цяпер поўнасцю рэабілітаваны, жывуць і працуюць разам з намі. Сярод іх пісьменнікі Алесь Звонак, Мікола Хведаровіч, Янка Скрыган, Сяргей Грахоўскі і іншыя. А тых, каго ўжо няма, таксама не забылі. Выдалі іх творы. Так што ўсё, як кажуць, стала на месца.

Радзіма прымае і тых, хто часова заблудзіўся, хто збіўся з дарогі і блукае ў пацемках. Пара адкрыць вочы і паглядзець на сапраўднасць, якая яна ёсць. Ты, напэўна, ведаеш пра Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 17 верасня 1955 года. Радзіма даравала тым, хто супрацоўнічаў з акупантамі. Дзякуючы гэтаму многія вярнуліся дадому і цяпер жывуць і працуюць разам з намі, як роўныя сярод роўных, і ніхто не папракае іх за мінулыя грахі. Кожны, у каго няма на руках крыві, можа зрабіць так, як яны.

Так, фашысты зруйнавалі Мінск, спалілі тысячы вёсак. Але гэта ўжо былое. Уся Беларусь у новабудоўлях. Цяпер нашу рэспубліку называюць рэспублікай вялікай хіміі. Полацкі нафтаперапрацоўчы, Гродзенскі азотнатукавы, Салігорскі калійны, Светлагорскі хімічны, Гомельскі суперфасфатны... Гэта ўсё камбінаты. А колькі чаго будуецца! Пра Мінск з яго індустрыяльнымі гігантамі дык і гаварыць няма чаго. Ім у адзін голас захапляюцца ўсе, хто пабываў у нашым стольным горадзе. Яны кажуць, што гэта адзін з прыгажэйшых гарадоў свету. Ты павінен памятаць, якім ты пакідаў Мінск, калі ўцякаў разам з фашыстамі ад Савецкай Арміі. Толькі руіны і бітая цэгла. Нечага гаварыць, цяжка нам было ў першыя пасляваенныя гады, але затое як радасна цяпер, як лёгка на сэрцы, калі ідзеш прыгожымі зялёнымі праспектамі, дыхаеш родным паветрам.

Вось так, Масей Сяднёў...

Памятаеш, восенню 1939 года, калі я ішоў у армію, сустрэў цябе на Віленскім скверы ў Мінску? Мы тады прыселі на лавачцы і ты чытаў свае новыя вершы. Добрыя вершы, прасякнутыя любоўю да чалавека. Гэта была сапраўдная лірыка. Верш «Хутчэй, зара!» я памятаю і зараз. А цяпер ты выдаеш за лірыку злосныя фашыстаўючыя вершы. Бач, як разыйшліся нашы дарогі. Не прынеслі табе «зары свабоды» крылы фашысцкага гругання. Крылы гэтыя падбіты раз і назаўсёды, і не засланяць ім больш ніколі нашага чыстага неба, не сеяць смерць. Мы святкуем Перамогу, як адсвяткавалі яе нядаўна 3 ліпеня гэтага года, урачыста і радасна, разам з усім савецкім народам, разам з нашымі сябрамі з-за мяжы. А цяпер у нас іх многа па ўсім свеце. Значыцца, праўда на нашым баку.

Мне думаецца, што калі ў цябе ёсць хоць кропля сумлення, ты адкажаш праз газету «Голас Радзімы».

Рыгор НЯХАЙ.

ПАДЗЯКА САВЕЦКІМ УРАЧАМ

АДЫС-АБЕБА. Тут адбыліся ўрачыстыя провады савецкіх урачоў, якія прапрацавалі больш двух год у шпіталі Чырвонага Крыжу і Чырвонага Паўмесяца СССР.

Развітваючыся з савецкімі калегамі, абісінскі ўрач Шыферау Вольдэ Георгіс сказаў:

— Мы ніколі не забудзем гэтых дзён дружбы і супрацоўніцтва. Наш народ удзячны савецкім урачам за чуласць, за дапамогу, аказаную многім з нашых аднапляменнікаў.

Савецкія ўрачы працавалі ў Адыс-Абебе з вялікай нагрузкай: за два гады шпіталь аказаў дапамогу дзесяткам тысяч хворых людзей. Тым не менш спецыялісты з СССР падрыхтавалі і апублікавалі два зборнікі навуковых работ па прафілактыцы і методыцы лячэння хворых у мясцовых умовах. Міністр аховы здароўя Эфіопіі ўручыў ім дыпломы.

ЯНЫ АДДАЛІ ПЕРАВАГУ ГДР

БЕРЛІН. Толькі за тры дні — з 1 па 3 верасня — у Германскую Дэмакратычную Рэспубліку перасялілася або вярнулася з ФРГ 130 чалавек. Яны пакінулі бонскую дзяржаву з-за матэрыяльных цяжкасцей і няўпэўненасці ў сваім будучым.

МОЛАДЗІ НЕ ШАНЦУЕ

НЬЮ-ЙОРК. Узровень беспрацоўя ў Злучаных Штатах зноў рэзка падскочыў у жніўні да 5,1 працэнта ад агульнай колькасці рабочай сілы краіны, паведаміў прадстаўнік бюро працоўнай статыстыкі. Рэзка ўзрасло беспрацоўе сярод амерыканскай моладзі. Адсутнасць рабочых месц для моладзі з'яўляецца адной з самых сур'ёзных праблем, якія стаяць перад урадам ЗША. Чакаемае павелічэнне наплыву моладзі на рынак працы ў бліжэйшыя некалькі год, заявіў прадстаўнік бюро працоўнай статыстыкі, як відаць, яшчэ вышэй узніме ўзровень беспрацоўя ў Злучаных Штатах.

СЕНАТ УШАНОЎВАЕ ПАМЯЦЬ П. ТАЛЬЯЦІ

РЫМ. Італьянскі сенат ушанаваў памяць Пальміра Тальяці. З прамовай, прысвечанай яго дзейнасці, выступіў сенатар-камуніст Умберта Тэрачыні.

Памяць Пальміра Тальяці ўшанавалі таксама сенатар ад італьянскай сацыялістычнай партыі пралетарскага адзінства Ск'явеці, сенатар ад сацыялістычнай партыі Талой, сенатар Ламі Старнуці ад італьянскай сацыял-дэмакратычнай партыі, сенатар ад хрысціянска-дэмакратычнай партыі Моні і сенатар ад ліберальнай партыі Баталья. Усе выступаўшыя адзначылі велізарную ролю, якую адыгрываў Пальміра Тальяці ў палітычным жыцці і пасляваеннай гісторыі Італіі.

НАША ДРУЖБА МОЦНАЯ, ЯК МЕТАЛ БХІЛАІ

ДЭЛІ. «Індыйска-савецкае эканамічнае супрацоўніцтва» — пад такім загалоўкам у вераснёўскім нумары часопіса «Індыян энд Форын рэвю» апублікаваны рэдакцыйны артыкул, у якім падкрэсліваецца, што візіт прэзідэнта Індыі д-ра Сарвапалі Радхакрышнана ў Савецкі Саюз паслужыць далейшаму ўмацаванню дружбы паміж дзвюма краінамі.

Сведчаннем гэтай дружбы, піша часопіс, з'яўляецца індыйска-савецкае эканамічнае і тэхнічнае супрацоўніцтва, якое пачалося ў 1955 годзе пасля абмену візітамі паміж прэм'ер-міністрам Індыі Дж. Неру і Старшынёй Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчовым.

У цяперашні час з дапамогай Савецкага Саюза ў Індыі будуецца каля 40 прамысловых прадпрыемстваў. Металургічны камбінат у Бхілаі з'яўляецца самым выразным прыкладам дапамогі Савецкага Саюза Індыі. Агульны даход ад прадукцыі камбіната ў 1963—64 гг. перавышае 117 мільёнаў рупій. Савецкі Саюз дапамагае Індыі ствараць сваё цяжкае машынабудаванне, вугальную і нафтавую прамысловасць. Прадпрыемствы, пабудаваныя з дапамогай Савецкага Саюза, уносяць значны ўклад у развіццё эканомікі Індыі і дапамагаюць ёй хутчэй дабіцца эканамічнай незалежнасці. Звяртаецца таксама ўвага і на сельскую гаспадарку, прыкладам чаму служыць Суратгархская ферма ў штаце Раджастан. Пры наведванні гэтай фермы ў красавіку 1959 года прэм'ер-міністр Неру адзначыў, што, «калі Індыя будзе мець сотню такіх ферм, то яе харчовая праблема будзе вырашана».

Індыйска-савецкае эканамічнае супрацоўніцтва садзейнічае таксама стварэнню нацыянальных індыйскіх тэхнічных кадраў, указвае далей часопіс.

Савецкі Саюз прадаставіў Індыі доўгатэрміновыя крэдыты на вельмі спрыяльных умовах. За апошнія 10 год у індыйска-савецкім гандлі адбыліся вялікія змены. Калі ў 1953 годзе агульны гандлёвы абарот раўняўся 10 мільёнам рупій, то ў 1963 годзе ён склаў 1 мільярд рупій.

Як і дапамога Савецкага Саюза Індыі, савецкі гандаль вядзецца на аснове, якая садзейнічае развіццю індыйскай эканомікі. Індыйска-савецкае супрацоўніцтва з'яўляецца ўзорам плённых эканамічных адносін паміж краінай, якая развіваецца, і індустрыяльнай дзяржавай, падкрэсліваецца ў рэдакцыйным артыкуле.

Няхай будзе моцнай наша дружба, як метал, які выплаўляецца на Бхілайскім заводзе, піша ў заключэнне часопіс.

«РУСКІЯ МАЮЦЬ ПРАВА ГАНАРЫЦЦА»

Мэр французскага горада Дзіжона канонік Фелікс Кір, які госціць у Савецкім Саюзе, сустрэўся ў Дзяржаўным камітэце Савета Міністраў СССР па культурных сувязях з замежнымі краінамі з савецкімі і замежнымі карэспандэнтамі.

Канонік Кір падкрэсліў, што ён даўно адчувае глыбокую любоў да рускіх людзей. «Без рускіх, без іх гераічных намаганняў у другой сусветнай вайне мы да гэтага часу працягвалі б знаходзіцца пад фашысцкім ярмом. Рускія маюць права ганарыцца тым, што яны зрабілі для свабоды чалавецтва»,—заявіў ён.

Яшчэ некалькі год назад, працягваў Кір, жыхары Дзіжона—пабрацімы Волгаграда — выказалі сваё захапленне дзейнасцю Старшыні Савета Міністраў СССР М. С. Хрушчова ў абарону міру. І не толькі Дзіжон, але ўвесь свет цэніць яго актыўную, наступальную палітыку ў барацьбе за мір.

Канонік Кір выказаў упэўненасць, што дружба паміж Францыяй і Савецкім Саюзам, якая заснавана на слаўных традыцыях, будзе ўмацоўвацца на карысць справе міру, на карысць савецкаму і французскаму народам.

АСЕННІ КІРМАШ

ЛЕЙПЦЫГ. Адкрыўся Міжнародны асенні лейпцыгскі кірмаш. Гасцінна расчыніліся дзверы шматлікіх павільёнаў, дзе дэманструюцца тавары шырокага ўжытку.

СССР прадставіў на кірмаш 5 тысяч экспанатаў. Сярод іх — гадзіннікі, кіна-і фотаапараты, радыёпрыёмнікі, тэлевізары, халадзільнікі, фарфор, тэкстыльныя тавары, пушніна.

АДРАСЫ ВЯДОМЫ

БРУСЕЛЬ. Вярбоўка наёмнікаў для арміі Чомбе праводзіцца не толькі ў ПАР і Паўднёвай Радэзіі, але і на тэрыторыі Бельгіі. Паведамляючы аб гэтым, бельгійскі штотыднёвік «Пан» указвае канкрэтныя адрасы вярбовачных пунктаў.

У Конга праз Франкфурт на самалётах заходнегерманскай авіякампаніі «Люфтганза» была накіравана першая група бельгійскіх наёмнікаў у колькасці 20 чалавек. Завербаваным наёмнікам выдаюцца білеты да Леапольдвіля, дзе яны заключаюць кантракты. Іх грашовыя рахункі падпісваюцца ў Конга былым бельгійскім генеральным консулам у Элізабетвілі палкоўнікам Ван дэ Вале.

ПА ВЕДЫ Ў СССР

У Беларускім дзяржаўным універсітэце на біялагічным факультэце займаецца група студэнтаў з Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам.

НА ЗДЫМКУ: студэнты на практычных занятках.

НА ДАПАМОГУ Ў БРАТНІЯ КРАІНЫ



АЛЖЫР. У гарах Вялікай Кабіліі будуецца каператыў «Уадзіас». Будаваць яго прыязджаюць тысячы маладых людзей з розных краін. У саставу будаўнічага атрада з Савецкага Саюза ўваходзяць студэнты Беларускага політэхнічнага інстытута Міхаіл Грыгор'еў і Канстанцін Хворак. Маладыя беларускія механізатары разам з іншымі студэнтамі нашай краіны павінны запланаваць, ачысціць ад каменняў і ўзараць тысячу гектараў зямлі. Гэта вялікая дапамога алжырскаму народу.

НА ЗДЫМКУ: Міхаіл ГРЫГОР'ЕЎ (стаіць) і Канстанцін ХВОРАК рыхтуюць трактары да палявых работ.

БАЛГАРЫЯ, 9 ВЕРАСНЯ...

Працоўныя Балгарыі ўрачыста адзначылі нацыянальнае свята—20-ю гадавіну сацыялістычнай рэвалюцыі ў краіне.

У яркім святочным убранні гарады і сёлы рэспублікі, усюды кумачовыя і трохкаляровыя нацыянальныя флагі. На вуліцах і плошчах тысячы і тысячы па-святочнаму настроеных людзей.

Маляўнічa выглядае гістарычная плошча імя 9 верасня ў сталіцы. На трыбуне маўзалея Г. Дзімітрава — кіраўнікі Балгарскай камуністычнай партыі і ўрада на чале з першым сакратаром ЦК БКП і старшынёй Савета Міністраў НРБ Тодарам Жыўкавым, кіраўнік савецкай партыйна-ўрадавай дэлегацыі сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў, кіраўнікі дэлегацый брацкіх сацыялістычных краін.

Пачынаецца ваенны парад. Перад трыбунамі праходзяць мотастралковыя, артылерыйскія, танкавыя, ракетныя войскі, аснашчаныя самай сучаснай ваеннай зброяй.

Пасля параду адбылася святочная дэманстрацыя працоўных.

Бясконцы паток велізарнага мора па-святочнаму апранутых людзей. Яны нясуць дыяграмы і транспаранты, якія расказваюць аб поспехах, дасягнутых балгарскім народам у будаўніцтве сацыялізма. Над калонамі дэманстрантаў — лозунгі, якія славяць непарушную балгара-савецкую дружбу, мір і дружбу паміж народамі.

Святочная дэманстрацыя працоўных сталіцы, у якой прыняло ўдзел каля 100 тысяч чалавек, працягвалася тры гадзіны і закончылася выкананнем яркага, маляўнічага нацыянальнага балгарскага танца «Харо».

ДРУГАЯ СУСТРЭЧА

Больш 130 прадстаўнікоў Францыі прыбылі ў Маскву на другую савецка-французскую сустрэчу. (Першая сустрэча праходзіла ў Францыі ў кастрычніку мінулага года). У ліку прыехаўшых — дэпутаты французскага парламента, мэры гарадоў, удзельнікі французскага Супраціўлення, вучоныя, рабочыя, дзеячы культуры, члены маладзёжных арганізацый.

— У нашай дэлегацыі — прадстаўнікі розных палітычных партый, але ўсіх іх аб'ядноўвае любоў да міру, — сказаў, выступаючы на мітынгу на Ленінградскім вакзале, вядомы французскі адвакат Андрэ Блюмель, адзін з прэзідэнтаў асацыяцыі «Францыя—СССР».

Французскіх гасцей вітаў намеснік старшыні прэзідыума Саюза савецкіх таварыстваў дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі Е. Іванов.

Беларускія ракі ў парыжскіх кафэ

Трэці год Полацкі рыбзавод вядзе промысел ракаў у мясцовых азёрах. Сярод аптовых спажыўцоў ракаў ёсць і некаторыя зарубежныя гандлёвыя фірмы — французскія, англійскія, дацкія, бельгійскія. У гэтым годзе, напрыклад, па паўтары тоны ракаў ужо адпраўлена самалётамі ў Францыю і Данію.

Адзін маленькі вытворчы «сакрэт»: амаль увесь улоў гэтага года — 40 цэнтнераў належыць толькі двум ракаловам рыбзавода — Луку Якаўлевічу Жыгунову і Міхаілу Андрэевічу Журыдаву. Яшчэ з дзіцячага ўзросту захапляліся яны лоўляй ракаў, навучыліся майстраваць з лазы хітрыя пасткі. Да канца сезона — надыходу халадоў — лаўцы разлічваюць здабыць яшчэ не менш чым 15 цэнтнераў ракаў.

Возера Белае — адно з прыгажэйшых куткоў Гродзеншчыны

На здымку: возера Белае ля вёскі Азёры.

Фота **Ул. Дагаева.**

«У КРАІ РОДНЫХ БЯРОЗ»

... У вёсцы Высокая Ліпа на Нясвіжчыне жылі калісьці два сябры: Антон Мікша і Уладзімір Галушка. Хлопцы былі ахвочыя да працы, але не было да чаго прыкласці ім свае працавітыя рукі. Усе землі навокал належалі таму, хто не сеяў і не жаў, — памешчыку. Бацька Галушкі меў на сям'ю з дзесяці душ каля трох дзесяцін зямлі. Прыблізна такі ж «маёнтак» меў бацька Мікшы. І рашылі хлопцы шукаць шчасця ў свеце.

Першым рушыў у дарогу Антон Мікша. Сабраў ён грошы і паехаў за акіян. А Уладзіміру Галушку не хапіла грошай на дарогу, застаўся ён дома.

Не соладка давялося за акіянам Мікшу. Карчаваў лес у Бразіліі, выдзіраў у няласкавай прыроды кавалак зямлі. І да ўсіх цяжкасцей і крыўд, якія даводзілася пераносіць, далучаўся сум па Радзіме.

Цяжкай і суровай была барацьба за лепшае жыццё пры панах і ва Уладзіміра Галушкі. Сапраўднае чала-

вечае шчасце прыйшло ў Высокую Ліпу 17 верасня 1939 года, калі над вёскай залунаў чырвоны сцяг. 25 год прайшло з таго незабыўнага дня.

Аб сваім жыцці, аб новым лёсе аднавяскоўцаў і расказвае Уладзімір Алексеевіч Галушка, старшыня калгаса «17 верасня», член Беларускага таварыства па культурных сувязях з суайчыннікамі за рубяжом у брашуры **«У краі родных бяроз»**, якая хутка папоўніць бібліятэкі чытачоў газеты «Голас Радзімы».

ПОДВИГ РИХАРДА ЗОРГЕ

Рассказ о героизме советского разведчика

ДАВНО закончилась вторая мировая война, в мирное время выросло новое послевоенное поколение людей. Но события двадцатипятилетней давности по-прежнему продолжают занимать умы политиков и историков, писателей и деятелей кино. С каждым днем становятся известными имена все новых и новых героев, которые в годы войны боролись и отдали жизнь за победу над фашизмом.

Некоторое время назад известным французским режиссером и сценаристом Ивом Чампи был снят фильм совместного франко-итало-японского производства «Кто вы, доктор Зорге?».

В фильме выведен образ советского разведчика, действовавшего в Японии в канун и во время второй мировой войны. И хотя мы не можем согласиться с трактовкой некоторых событий, поданных с точки зрения буржуазной историографии, достоинств фильма отрицать нельзя. В нем с большой художественной силой рассказывается о Рихарде Зорге, работавшем вначале журналистом, а затем дипломатом в германском посольстве в Токио.

Да, Рихард Зорге, советский разведчик, — фигура, не вымышленная сценаристом. Такой человек существовал. Это был наш соотечественник, товарищ и единомышленник, бесконечно преданный идеям коммунизма и до конца выполнивший свой долг перед Родиной.

ЗОРГЕ родился в 1895 году в городе Баку в семье техника, работавшего на нефтяных промыслах. Его отцом был немец, а мать — русская. Рихард был внуком Фридриха-Адольфа Зорге, ученика и соратника Карла Маркса.

Когда мальчику исполнилось три года, родители Зорге переехали из Баку в Берлин, где он и получил образование. В 1914 году во время первой мировой войны Рихард Зорге был призван в армию. На фронте был трижды ранен. Он понял всю нелепость этой войны, войны между двумя его родинами — родиной отца — Германией и родиной матери — Россией, в которой он родился.

Победа в России Великой Октябрьской социалистической революции заставила молодого Зорге посмотреть на происходящие вокруг него события по-новому. Он посвятил себя служению делу мира. В 1919 году Зорге вступил в члены Компартии Германии, стал принимать активное участие в революционной борьбе.

Вынужденный скрываться от преследования властей, Зорге работал чернорабочим в каменноугольной промышленности в Аахене и в Нидерландах, преподавал на партийных курсах, редактировал партийную газету.

В начале 1925 года Зорге представилась возможность вернуться на Родину. Он переехал в Москву и в том же году вступил в ряды ВКП(б).

Наступил 1929 год. В Германии начали подымать голову милитаристы, рвался к власти фашизм. Японская военщина на Востоке все больше стала угрожать своим соседям. В воздухе запахло войной.

Зорге понимал, что мир — это большая драгоценность и охранять его должны не только военные и дипломаты. Он считал, что наиболее всего для него подходит работа в разведке.

На первый взгляд, профессия разведчика кажется легкой и романтичной. Но Зорге отлично понимал, что все не так просто, как это выглядит в занимательной литературе. Разведчик — это прежде всего политик, который должен уметь схватить, проанализировать и связать в своем уме события, казалось бы, вовсе не связанные между собой. Зорге считал, что разведчик должен быть всегда впереди событий и прокладывать дорогу другим.

В НАЧАЛЕ он отправляется в Шанхай, откуда шлет статьи в немецкие газеты, а затем переезжает в Токио в качестве корреспондента «Франкфуртер цайтунг».

Рихард Зорге был высокоэрудированный, живой, обаятельный человек. Он быстро приобрел репутацию крупного специалиста по Японии и лучшего журналиста, к мнению которого начали прислушиваться не только в германском посольстве в Токио, но и в Берлине.

Менее всего Зорге был похож на тех таинственных разведчиков, которых создало воображение некоторых западных писателей. Он не взламывал сейфов для того, чтобы похитить секретные документы, их показывали ему сами владельцы этих документов. Он не стрелял из пистолета, чтобы проникнуть туда, куда ему необходимо было проникнуть. Двери любезно открывали перед ним хозяева секретов. Он был всегда бодр и весел, вокруг него всегда была масса людей самых различных положений и взглядов. И с ним стремились познакомиться все.

В течение ряда лет Рихард Зорге был одним из самых влиятельных членов немецкой колонии и нацистской партийной организации в Токио. Он тесно подружился и стал фактически советником немецкого военного атташе, которого не без содействия Зорге в 1938 году назначили послом Германии в Токио. Авторитет, завоеванный им в журналистских кругах и в немецкой колонии в Токио, способствовал упрочению его положения и позволил ему занять пост пресс-атташе посольства Германии в Японии.

Для разведки всегда имело немаловажное значение умение играть избранную роль. Рихард Зорге, оказавшись в пестрой немецкой колонии в Токио, среди служак, дельцов, нацистов, блестяще играл роль «патриота» Германии и «убежденного» нациста. Это открыло перед ним еще более широкие возможности. Германский посол стал советоваться с ним буквально по всем вопросам отношений Германии с Японией и показывать ему переписку с Берлином.

Кое-кто считал его в то время гулякой, увлекающимся красивыми женщинами, вином и танцами. И никто не подозревал, что за внешней беззаботностью скрываются острая, напряженная работа ума и предельная собранность воли. Его работоспособность потрясающа. Он не забывал о деле в любой ситуации. И везде работал: шел ли прием в посольстве, новогодний бал или прогулка на яхте баронессы Юки Сакураи.

Это был необыкновенно смелый и находчивый разведчик. Чтобы установить потерянную связь с центром, необходимо было пробраться в Гонконг. Между Японией и Китаем шла война, и журналист Зорге отправился на передовую. Немецкая колония в Токио, затаив дыхание, следила по репортажам своего кумира за наступлением японцев в Китае. «Его статьи во «Франкфуртер цайтунг» имели большее влияние на хозяев третьего рейха, чем десять дипломатических докладов», — говорит бывший заведующий протокольным отделом германского посольства Ганс Отто Мейснер. (Кстати, он является главным консультантом авторов фильма и играет самого себя).

Рихард Зорге завязал многочисленные связи не только в немецкой колонии. У него было много искренних друзей среди патриотически настроенных японцев, как Одзаки Озуми, советник тогдашнего премьер-министра Японии принца Коноэ.

1939 год. Гитлер и его приближенные, поощряемые западными правительствами, оккупируют одну страну за другой. Постепенно фашизм обращает взоры на Польшу. Зорге заблаговременно узнает об этом и сообщает в Москву дату нападения Германии на Польшу.

Находясь на другом конце оси Берлин — Рим — Токио и наблюдая лихорадочную деятельность германского посольства, он, естественно, располагает большой информацией и делает все, чтобы она стала достоянием Советского правительства.

Роковой 1941 год. В Москву летит сообщение: 150 немецких дивизий совершат нападение на советскую границу не позже 20 июня. Затем Зорге уточняет дату — 22 июня. Рихарду Зорге принадлежит заслуга в том, что он добыл точные данные о дате нападения Гитлера на Советский Союз, но его информация в силу обстановки, сложившейся в нашей стране под влиянием культа личности Сталина, была оставлена без внимания. Самоотверженность Зорге и его помощников помогли в тяжелые для Родины дни, когда враг был на подступах к Москве, сконцентрировать военные усилия на советско-германском фронте. Именно Зорге сообщил точные и убедительные данные о том, что японская военщина сосредоточивает силы для войны на Тихом океане. Это позволило советскому командованию перебросить часть сил с Дальнего Востока на германский фронт.

Хотя деятельность Зорге протекала в Токио, но она прежде всего была направлена против фашистской Германии. Велик и неоценим был вклад Рихарда Зорге в битве за Москву и на Волге. Сведения, сообщенные им и его товарищами, сыграли свою роль и оказали огромную услугу в борьбе с гитлеровской армией.

В РЕЗУЛЬТАТЕ непредвиденных обстоятельств японская полиция напала на след членов группы Зорге. Начались аресты. 18 октября 1941 года был арестован и Рихард Зорге. Он несколько лет томился в тюрьме, но до конца оставался верен Родине.

Наступил известный перелом в войне на Тихом океане. Японские правящие круги, опасаясь поражения в войне, поспешили расправиться с мужественным и страшным для них коммунистом Зорге.

Он был казнен утром 7 ноября 1944 года.

Могила героя находится на кладбище Тамобати в Токио. За ней бережно ухаживает японка, которая, как свидетельствуют авторы фильма, заявляет: «Я ухаживаю за этой могилой. Я любила Рихарда Зорге. Я люблю его и сейчас».

Подвиг Зорге известен во многих странах мира. Теперь он известен и народам Советского Союза, за дело которого он боролся и отдал жизнь.

Н. ПЕКЕЛЬНИК.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС
Мінск, Ленінскі праспект, 77,
Дом друку.
Рэдакцыя газеты
«Голас Радзімы».